**Пасланне да Раджджаства Хрыстовага**
**Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла**
**архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам**
**і ўсёй пастве Рускай Праваслаўнай Царквы**

**Узлюбленыя ў Госпадзе архіпастыры, пачэсныя прасвітары і дыяканы, багалюбныя інакі і інакіні, дарагія браты і сёстры!**

Сардэчна віншую ўсіх Вас са светлазарным святам Раджджаства Госпада Бога і Спасіцеля нашага Іісуса Хрыста і звяртаюся да вас словамі старажытнага царкоўнага гімна: *«Хрыстос нараджаецца – слаўце! Хрыстос з нябёсаў – сустракайце! Хрыстос на зямлі – узносцеся!»* (ірмос 1-й песні Раджджэственскага канона).

Апостал Павел назваў здзяйсненне падзеі Богаўцялеснення *вялікай набожнасці тайнай* (1 Цім. 3, 16). Перад гэтай тайнай у трымценні змаўкае ўсякае зямное мудраванне. Перад ёю робяцца цьмянымі марныя чалавечыя веды. Яна здольная абяззброіць і змякчыць самае грубае і скамянелае сэрца. Пасярод жорсткасці і азлобленасці гэтага свету нараджаецца Той, хто Адзіны можа вылечыць любую раз'яднанасць, дараваць нам сапраўдны мір і сапраўднае шчасце.

З таго часу, як у чалавечае жыццё ўвайшоў грэх, на зямлі запанавала трагічнае раздзяленне – і свет, адарваны ад Тварца, існіннай Крыніцы святла, немінуча стаў апускацца ў цемру і хаос. Але Бог не адмовіўся ад Свайго тварэння і не пакінуў яго без апекі. Цярпліва рыхтуючы наша спасенне, Гасподзь уцялесніўся, увайшоў у зямную гісторыю і стаў адным з нас. Сын Божы стаў Сынам Чалавечым, ва ўсім падобным да нас, акрамя граху. Тое поўнае смутку пытанне *«дзе ты, Адам?»,* што прагучала некалі ў садзе Эдэма, атрымала, нарэшце, адказ ва ўбогай пячоры паблізу Віфлеема. *«Першы чалавек – з зямлі, зямны; другі чалавек – Гасподзь з неба»* (1 Кар. 15, 47), як пісаў апостал Павел. У Хрысце, як у новым Адаме, *Бог прымірыў з Сабою свет* (2 Кар. 5, 19), абнавіў чалавечую прыроду, ацаліўшы яе ад ран граху.

Жыццё чалавека і жыццё ўсяго свету ацаляюцца толькі Богам – вось тая простая, але вельмі важная ісціна, пра якую сведчыць сённяшняе свята. Як тут не ўспомніць натхнёных слоў блажэннага Аўгусціна, які са свяшчэнным трымценнем праслаўляў мудры Промысел Уседзяржыцеля! *«Ты стварыў нас для Сябе, і не ведае спакою сэрца наша, пакуль не супакоіцца ў Табе»* (аўтабіяграфічны твор «Споведзь»). Толькі ў Хрысце Іісусе дасягаецца адзінства з Богам і адкрываецца сапраўдны сэнс жыцця чалавека, ад стварэння свету пакліканага да вечнасці.

Прышэсце Спасіцеля ў свет – гэта перш за ўсё адкравенне пра Божую любоў да людзей: любоў, з аднаго боку, бязмежную і ўсёпераможную, а з другога – ціхую, якая *ўсё пакрывае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, ўсё пераносіць* (1 Кар. 13, 7).

Як жа нам з годнасцю адказаць на вялікую любоў нашага Тварца і наблізіцца да Яго? Гэтая блізкасць дасягаецца і пацвярджаецца намі праз выкананне евангельскіх запаведзяў, праз цярпенне і некрывадушную любоў адзін да аднаго, а галоўнае – праз пастаяннае абнаўленне нашага адзінства з Хрыстом у Таінстве Святой Еўхарыстыі.

Сёння свята надзеі. Свята міру. Свята ціхай радасці. Праслаўляючы і сустракаючы Народжанага Спасіцеля прыгожымі спевамі і царкоўнымі гімнамі, будзем памятаць пра высокае хрысціянскае пакліканне быць *святлом свету і соллю зямлі* (Мф. 5, 13-14) і*, пакуль ёсць час, будзем рабіць дабро ўсім, а найбольш сваім аднаверцам* (Гал. 6, 10). Падорым надзею гаротным, суцешым засмучаных, падзелімся радасцю з блізкімі і далёкімі і дапаможам тым, якія жывуць у нястачы, – так паступаючы, мы станем сапраўды *Хрыстовай духмянасцю Богу* (2 Кар. 2, 15) і прынясем дары Госпаду, Які нарадзіўся.

Да тых жа, хто яшчэ з прычыны розных абставін пакуль знаходзіцца па-за спасіцельнай агароджай Царквы і не ўдзельнічае ў жыцці Хрыстовай абшчыны, звяртаюся з заклікам: адкрыйце сваё сэрца Таму, *Хто так узлюбіў свет, што Сына Свайго Адзінароднага даў, каб кожны, хто веруе у Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае* (Ін. 3, 16). Праславім жа Госпада і Спасіцеля за Яго невымоўную міласць і любоў да роду чалавечага.

Віншуючы ўсіх са святам Раджджаства, жадаю вам, мае дарагія, моцы сіл і невычэрпнай радасці аб Спасіцелі, Які нарадзіўся. *Благадаць вам і мір ад Бога, Айца нашага, і Госпада Іісуса Хрыста* (Эф. 1, 2). Амінь.

ПАТРЫЯРХ МАСКОЎСКІ І ЎСЯЕ РУСІ

*Раджджаство Хрыстова*

*2025 / 2026 г.*

*Масква*